# Еўрапейская хартыя мясцовага самакіравання: Ключавая дамова для мясцовай дэмакратыі

Вы можаце азнаёміцца з поўным тэкстам:

Або па спасылцы: https://rm.coe.int/1680b58bc3

ЗМЕСТ

Кангрэс мясцовых і рэгіянальных улад Рады Еўропы ..... 5
Еўрапейская хартыя мясцовага самакіравання ..... 9
Дадатковы пратакол да Еўрапейскай хартыі мясцовага самакіравання аб праве на ўдзел у справах мясцовых органаў улады ..... 22
Еўрапейская хартыя мясцовага самакіравання — Тлумачальны даклад ..... 31
Актуальны каментар Кангрэсу да тлумачальнага дакладу па Еўрапейскай хартыі мясцовага самакіравання ..... 53
Рэзалюцыя 460 (2020) ..... 55

# СЛОЎНІК ТЭРМІНАЎ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ

## – А –

**1. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка** - частка адзінай, цэласнай тэрыторыі дзяржавы, якая з'яўляецца прасторавай асновай для арганізацыі і дзейнасці рэгіянальных органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання. На адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі падзяляецца тэрыторыя **ў**нітарнай дзяржавы і тэрыторыя суб'ектаў федэрацыі ў федэратыўных дзяржавах. Адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі не маюць  палітычнай самастойнасці.

**2. Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне** – гэта тэрытарыяльная арганізацыя дзяржавы з падзелам яе на складовыя часткі – адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі. Такі падзел можа быць двухзв**ё**нным – вобласці (губерніі, акругі, правінцыі) – абшчыны (муніцыпіі, камуны); тр**о**хзв**ё**нным – вобласці – раёны – абшчыны; чатырохзвённым – рэгіёны – вобласці – раёны – абшчыны.

**3. Асацыяцыі або саюзы тэрытарыяльных абшчын** – аб'яднанні тэрытарыяльных абшчын, якія ствараюцца ў мэтах каардынацыі іх дзейнасці, больш эфектыўнай рэалізацыі сваіх правоў і прадстаўлення сваіх  інтарэсаў.

## – Б –

**4. Бюджэт грамадзянскага ўдзелу** – спосабы і формы ўдзелу грамадзян у размеркаванні выдаткаў часткі мясцовага бюджэту праз фінансаванне праектаў грамадзянскіх ініцыятываў, прапанаваных жыхарамі тэрытарыяльнай супольнасці і накіраваных на вырашэнне пытанняў мясцовага значэння.

**5. Бюджэтны працэс** - гэта дакладна фармалізаваная паслядоўнасць дзеянняў, звязаных са складаннем праектаў бюджэтаў, іх разглядам і зацвярджэннем, з далейшым выкананнем і кантролем за іх выкананне.

**6. Бюджэтнае рэгуляванне** - працэс размеркавання прыбыткаў і пераразмеркаванне сродкаў паміж бюджэтамі розных узроўняў у мэтах вырашэння  прыбытковай базы мясцовых бюджэтаў, які ажыццяўляецца з улікам дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў.

## – В –

**7. Выбарная службовая асоба мясцовага самакіравання** - службовая асоба мясцовага самакіравання, якая выбіраецца на аснове ўсеагульнага роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні на мясцовых выбарах.

**8. Выбары** - форма прамога волевыяўлення грамадзян, якое ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і законамі краіны, статутамі мясцовых супольнасцяў у мэтах фарміравання органа дзяржаўнай улады, органа мясцовага самакіравання або надзялення паўнамоцтвамі службовай асобы.

## – Г –

**9. Гарантыі мясцовага самакіравання** - умовы і сродкі, якія дазваляюць забяспечыць рэалізацыю і эфектыўную прававую абарону мясцовага самакіравання.

**10. Грамадзянскія ініцыятывы** - адна з формаў волевыяўлення грамадзян і прадстаўнікоў інстытутаў грамадзянскай супольнасці, накіраваная на вырашэнне важных праблем грамадскай значнасці.

**11. Грамадзянская супольнасць** - гэта грамадства адкрытага тыпу, дзе правы і свабоды грамадзян канстытуцыйна афармлены і абаронены ад любога замаху. Гарантыяй гэтага служыць падзел уладаў, наяўнасць легальнай апазіцыі, вяршэнства закону, юрыдычна афармленыя і рэалізаваныя свабода слова, друку, плюралізм меркаванняў у СМІ. Грамадзянская супольнасць – гэта сфера самапраявы інтарэсаў і волі свабодных індывідаў і іх асацыяцый, абароненая законамі ад прамога ўмяшання, а таксама адвольнай рэгламентацыі з боку органаў дзяржаўнай улады.

**12. Грамадзянскі ўдзел у прыняцці ўладных рашэнняў** – гэта бесперапынны працэс узаемадзеяння паміж грамадскасцю і органамі муніцыпальнай улады, на этапах падрыхтоўкі і прыняцця, выканання і кантролю рашэнняў.

## – Д –

**13. Дэлегаваная кампетэнцыя** - паўнамоцтвы органаў дзяржаўнай адміністрацыі, перададзеныя органам мясцовага самакіравання законам.

**14. Дэмакратыя** - адна з асноўных форм праўлення, палітычнай і сацыяльнай арганізацыі грамадства, дзяржавы і ўлады, форма палітычна арганізаванага грамадства, характэрнымі рысамі якой з'яўляюцца: выбарнасць улады, прыярытэт правоў і свабод чалавека ў дзейнасці ўладных структураў, палітычны плюралізм, прызнанне і гарантаванне мясцовага самакіравання.

**15. Дэцэнтралізацыя** – перадача часткі ўладна-кіраўнічых паўнамоцтваў і функцый ад органаў дзяржаўнай улады органам мясцовага самакіравання.

## – Е –

**16. Еўрапейская Хартыя Мясцовага Самакіравання** - дакумент Савета Еўропы, які мае на мэце абарону і ўмацаванне мясцовай аўтаноміі ў Еўропе і які валодае статусам еўрапейскай канвенцыі. Хартыя абавязвае сваіх удзельнікаў прымяняць асноўныя прававыя нормы, якія гарантуюць палітычную, адміністрацыйную і фінансавую незалежнасць мясцовых уладаў.

## – К –

**17. Камунальная ўласнасць** - маёмасць, якая належыць тэрытарыяльнай супольнасці, уключаючы грашовыя сродкі, зямлю і іншыя прыродныя рэсурсы, а таксама створаныя

ёй камунальныя прадпрыемствы і ўстановы. Камунальная ўласнасць складаецца з мясцовай казны і маёмасці, замацаванай за камунальнымі юрыдычнымі асобамі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

**18. Кампетэнцыя органаў мясцовага самакіравання** - сукупнасць іх паўнамоцтваў, замацаваных Канстытуцыяй, законамі і іншымі нарматыўна-прававымі актамі, у адпаведнасці і ў рамках якіх яны ажыццяўляюць сваю дзейнасць у тых ці іншых сферах мясцовага жыцця, у межах адпаведных тэрытарыяльных супольнасцяў.

## – М –

**19. Мясцовае самакіраванне** - права і фактычная здольнасць самакіравальнай тэрытарыяльных супольнасцяў ажыццяўляць кіраванне і вырашаць у рамках законаў пад сваю адказнасць значную частку публічных спраў у інтарэсах грамадзян, якія пражываюць на адпаведнай тэрыторыі.

**20. Мэр** - кіраўнік выканаўчай улады тэрытарыяльнай абшчыны.

**21. Мясцовы бюджэт** - форма атрымання і  выдаткоўвання грашовых сродкаў, прызначаных для фінансавага забеспячэння задач і функцый мясцовага самакіравання.

**22. Мясцовы рэферэндум** - адна з формаў прамога волевыяўлення грамадзян па найбольш важных пытаннях мясцовага значэння, якая ажыццяўляецца праз галасаванне грамадзян, якія валодаюць правам на ўдзел у рэферэндуме.

## – Н –

**23. Нагляд** - сістэма праверкі захавання закона ў працэсе ажыццяўлення розных відаў дзейнасці з наступным ініцыяваннем працэдуры прыцягнення да юрыдычнай адказнасці за парушэнні заканадаўства.

## – О –

**24. Органы мясцовага самакіравання** - органы, надзеленыя ўласнымі паўнамоцтвамі па рашэнні пытанняў мясцовага значэння, абраныя непасрэдна насельніцтвам і (або) утвораныя прадстаўнічым органам мясцовага самакіравання. Органы мясцовага самакіравання не ўваходзяць у сістэму органаў дзяржаўнай улады.

## – П –

**25. Петыцыя** — калектыўны зварот ў пісьмовай форме, скіраваны да ўладаў, адзін са спосабаў выказвання грамадскай думкі.

**26. Паўнамоцтвы мясцовага самакіравання** - правы і абавязкі, якія замацоўваюцца ў заканадаўчым парадку, неабходныя для выканання ўскладзеных на яго функцый.

**27. Правы чалавека** - гэта натуральныя, неадчужальныя правы, якія належаць яму ў сілу нараджэння як асобы. Да ліку неадчужальных правоў чалавека звычайна адносяць права на жыццё, свабоду, бяспеку, уласнасць, фізічную і псіхічную недатыкальнасць, годнасць асобы, асабістую і сямейную таямніцу і інш. Гэтыя правы дзяржаўная ўлада не можа даравацьабо адчужаць сваімі актамі і дзеяннямі.

**28. Прадстаўнічы орган мясцовага самакіравання** - выбарны орган мясцовага самакіравання, які валодае правам прадстаўляць інтарэсы насельніцтва і прымаць ад яго імя рашэнні, якія дзейнічаюць у межах падведамнай яму тэрыторыі.

**29. Публічныя слуханні** - абмеркаванне, з удзелам насельніцтва, ў органах мясцовага самакіравання важных пытанняў мясцовага значэння.

**30. Публічнае кіраванне** - гэта сістэма кааперацыі дзяржаўных, няўрадавых, прыватных і змешаных структур, закліканая забяспечыць задавальненне грамадскіх інтарэсаў і вырашэнне калектыўных праблем.

## – Р –

**31. Рэгламент органа мясцовага самакіравання** - дакумент, які вызначае парадак работы органа мясцовага самакіравання і прыняцця ім рашэнняў.

## – С –

**32. Сацыяльныя стандарты** – гэта сукупнасць сацыяльных запатрабаванняў насельніцтва, а таксама запатрабаванняў на ўтрыманне ўстаноў несацыяльнай сферы, якія фінансуюцца з бюджэту, на адным з узроўняў забяспечанасці: мінімальным, сярэднім, рацыянальным – што выяўляецца ў сацыяльных нормах і нарматывах.

**33. Службовая асоба мясцовага самакіравання** – выбарная, або найманая па кантракце (працоўнай дамове) асоба, надзеленая выканаўча-распарадчымі паўнамоцтвамі па вырашэнні пытанняў мясцовага значэння або паўнамоцтвамі па арганізацыі дзейнасці органаў мясцовага самакіравання

**34. Служачы мясцовага самакіравання** – абраная, прызначаная ці прынятая па кантракце асоба, якая выконвае ў парадку, што вызначаны муніцыпальнымі прававымі актамі і адпаведнымі законамі, працоўныя абавязкі ў органах мясцовага самакіравання за грашовае ўтрыманне коштамі сродкаў мясцовага бюджэту.

**35. Субсідыярнасць** – прынцып кіравання, пры якім на больш высокі узровень улады выносіцца вырашэнне толькі тых пытанняў, якія не могуць быць вырашаны на больш нізкім узроўні.

## – Т –

**36. Тэрытарыяльная арганізацыя грамадства** - узаемаабумоўленае спалучэнне і функцыянаванне сістэм рассялення, гаспадаркі і прыродакарыстання, сістэм інфармацыі і жыццезабеспячэння, адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання і кіравання, якое склалася на пэўным этапе сацыяльна-эканамічнага развіцця ў грамадстве.

**37. Тэрытарыяльнае грамадскае самакіраванне (ТГС)** - органы, якія ствараюцца грамадзянамі на добраахвотнай аснове па месцы іх жыхарства на частцы тэрыторыі абшчыны (тэрыторыі мікрараёнаў, жыллёвых комплексаў, кварталаў, вуліц, двароў, пасёлкаў, вёсак і інш.), якія дзейнічаюць у адпаведнасці з заканадаўствам, у мэтах вырашэння пытанняў мясцовага значэння.

**38. Тэрытарыяльная (мясцовая) супольнасць** - супольнасць людзей, якія пражываюць на пэўнай тэрыторыі і аб'яднаны агульнымі інтарэсамі ў вырашэнні на прынцыпах самакіравання пытанняў жыццядзейнасці праз выкарыстанне і развіццё мясцовых матэрыяльных і сацыяльных рэсурсаў (напрыклад, землі, муніцыпалітэты і абшчыны ў Германіі; рэгіёны, правінцыі, дэпартаменты, муніцыпалітэты і камуны ў Францыі; тэрытарыяльныя грамады ва Украіне і г. д.).

**39. Тэрытарыяльная абшчына** - базавая тэрытарыяльная адзінка ў сістэме мясцовага самакіравання.

## – У –

**40. Уласныя мясцовыя даходы** – устаноўленыя законам падатковыя і непадатковыя плацяжы, якія замацоўваюцца за мясцовымі бюджэтамі цалкам або часткова на пастаяннай аснове, а таксама тыя якія ўводзяцца прадстаўнічымі органамі мясцовага самакіравання ў адпаведнасці з заканадаўствам, для накіравання ў мясцовыя бюджэты.